# Памяць пра Яна Скрыгана



***16 лістапада споўнілася 118 гадоў з дня нараджэння Яна Скрыгана (1905 – 1992). На ўшанаванне памяці пісьменніка 18 лістапада адбылося ўрачыстае адкрыццё памятнага каменя.***

Ян (Іван Аляксеевіч) Скрыган – беларускі празаік і паэт, публіцыст і крытык, адзін з першапраходцаў беларускага нарыса як новага літаратурнага жанру, і гэтая малая форма стала ўзорам яго багатай і глыбока нацыянальнай творчасці.

Пісьменнік нарадзіўся ў вёсцы Труханавічы Слуцкага павета ў сялянскай сям'і. Пачатковую адукацыю атрымаў у мясцовай царкоўна-прыходскай школе, потым вучыўся ў Слуцку ў беларускай гімназіі і сельскагаспадарчым тэхнікуме. Памяць пра Яна Скрыгана захоўваецца на яго малой радзіме. Труханавічы, Камень, Капыль – мясціны, дзе яго добра ведаюць, ёсць асобныя знакі, якія нагадваюць пра знакамітага земляка. На малой радзіме Яна Скрыгана, у вёсцы Труханавічы Капыльскага раёна, у бацькоўскай хаце з часам плануецца стварыць музей.

Дзякуючы намаганням дачкі пісьменніка Галіны Скрыган з 11 лістапада 2011 года ў Каменскім вучэбна-педагагічным комплексе дзіцячы сад – сярэдняя школа (аграгарадок Камень Капыльскага раёна) адкрылася экспазіцыя, прысвечаная Яну Скрыгану. Цяпер гэта гісторыка-краязнаўчы музей «Бацькаўшчына». У яго сталай экспазіцыі дэманструюцца асабістыя прадметы Яна Скрыгана: рабочы стол пісьменніка і славутыя скрыганаўскія кіёчкі, якія ён вырабляў сам і дарыў сябрам-калегам, а таксама шахматы. Тут можна ўбачыць арыгіналы дакументаў і рукапісаў, фотаздымкі, медалі, граматы і ўзнагароды, атрыманыя за літаратурную і навуковую працу. Новыя экспанаты ўвесь час папаўняюць музей дзякуючы Галіне Скрыган.

У Капылі ёсць вуліца, якая носіць імя беларускага пісьменніка. Яна з'явілася па прапанове краязнаўца, гісторыка, дырэктара Капыльскай СШ № 2 Барыса Багдановіча. 5 верасня 2021 года на XXVIII Дні беларускага пісьменства ў Капылі адкрылася Алея пісьменнікаў, ураджэнцаў Капыльшчыны, дзе Галіна Скрыган прэзентавала памятны знак у выглядзе літары «С», прысвечаны пісьменнікам Яну Скрыгану і Васілю Сташэўскаму. Своеасаблівы знак аздоблены QR-кодам, які дазваляе пазнаёміцца з кароткай інфармацыяй пра жыццё і лёс творцаў.

18 лістапада 2023 года памятны камень у гонар Яна Скрыгана ўсталяваны каля вёскі Гарадзішча Слуцкага раёна. Ён знаходзіцца каля былога фальварка Хваявіца Слуцкага раёна Слуцкай акругі БССР (1924 – 1926), дзе бацька пісьменніка Аляксей купіў зямлю і куды перавёз сваю сям'ю. Пасля Труханавічаў для Яна гэта была другая мясціна, якую *«ён з цеплынёй і сардэчнасцю ўзгадваў у сваіх мастацкіх творах і дзённіках»*, – адзначыла Галіна Скрыган на ўрачыстым адкрыцці помніка. Менавіта адсюль і пайшоў Янка Скрыган у шырокі свет, пераадолеў пакручастыя пуцявіны лёсу, наканаванага яму. На Случчыне з'явіўся новы помнік, які знаходзіцца на Скрыганавай паляне, як яе называюць мясцовыя жыхары, – тыя 45 гектараў зямлі, якую набыў яго бацька. На камені пазначаны час, калі тут жыў Янка Скрыган – 1915 – 1925 гады. Цудоўныя словы пісьменніка, выбітыя на камені, сталі выдатным сведчаннем яго клопату пра захаванне нацыянальнай мовы і культуры: *«Вялікую чарадзейную сілу мае слова. Сапраўды варта быць пісьменнікам, каб любіць яго і адчуваць»*. У жыцці пісьменніка мова была прафесіяй і працай, ён прымаў удзел у фарміраванні сучаснай літаратурнай мовы ў 1920 – 1930-х гадах.



*Выступае Галіна Скрыган*

Усталяванне памятнага каменя, арганізацыя ўрачыстага мерапрыемства да яго адкрыцця былі падрыхтаваны членамі сям'і Скрыганоў, якія жывуць у Слуцкім раёне, захоўваюць памяць пра свайго знакамітага продка. На адкрыццё сабраліся ўсе галіны Скрыганавага роду – Скрыганы, Булгакі, Шыманскія, Сасноўскія, Міронччыкі, якія жывуць не толькі пад Слуцкам, але і каля Маладзечна, Брэста. Прыехалі родзічы і з далёкага Ніжняга Ноўгарада, якія добра памятаюць радзіму і свае карані. Таксама былі запрошаны госці, якія сказалі шмат добрых слоў пра пісьменніка.

Самай ганаровай госцяй стала Галіна Скрыган – дачка Яна Скрыгана, якая разам з ініцыятарамі мерапрыемства адкрыла помнік пісьменніку. Завітала і беларуская пісьменніца, перакладчыца і журналістка Хрысціна Лялько. У кнізе «Слова пра Яна Скрыгана: успаміны» (2005), укладзенай Галінай Скрыган да 100-гадовага юбілею бацькі, яна згадвала выказванні Скрыгана – майстра роднай мовы: *«У бацькаўшчыны ёсць заўсёды галоўны знак – яе мова»*, *«Можна грэбаваць чалавекам, а моваю нельга грэбаваць, бо гэта народ»*. На мерапрыемстве яна прачытала напісаны напярэдадні верш, прысвечаны пісьменніку і роду Скрыганоў, які ўшаноўвае яго памяць. Выступіла на адкрыцці і кіраўнік згаданага музея «Бацькаўшчына» Ірына Тагіль, актыўная ўдзельніца ўсіх мерапрыемстваў, дзе ўшаноўваецца памяць пісьменніка-земляка.

Да гэтай даты быў падрыхтаваны яшчэ адзін падарунак усяму роду пісьменніка – кніга-даследаванне, выкананае Генеалагічным агенцтвам Wenda «Гісторыя роду Скрыганоў» (2023). Даследчыкі Вітольд Ханецкі і Ірына Завадская на працягу двух гадоў рыхтавалі яе, збіраючы звесткі з архіваў. У кнізе пацверджана меркаванне Яна Скрыгана: *«Бацька быў патомны труханаўскі мужык. Дарэчы, увесь час мяне не пакідае перакананне, што ўсе Скрыганы паходзяць з Труханавіч»*. Архіўныя росшукі паказалі, што роданачальнік усіх Скрыганоў зваўся Фёдарам, напрыканцы XVI стагоддзя ён быў адзіным носьбітам такога прозвішча ў Труханавічах. *«У 1590 годзе гэты Фёдар дзяліў двор з Міхалам Яневічам (магчыма, сваяком), маючы ў гаспадарцы адну валоку зямлі на дзве іхнія сям'і (прыблізна 21 га)»*. Усе мясцовыя жыхары вёскі, акрамя трох баярскіх сем'яў, належалі Мікалаю Крыштафу Радзівілу «Сіротку». Кніга-даследаванне на мерапрыемстве была ўручана ў якасці падарункаў Галіне Скрыган, музею «Бацькаўшчына» і прадстаўнікам розных галін роду Скрыганоў і Булгакаў.

Запрасілі на мерапрыемства і мяне з мужам. Прыемна было знаходзіцца сярод сямейнікаў роду Скрыганоў, простых і шчырых беларусаў, якія памятаюць пра свайго знакамітага продка. З цікавасцю яны слухалі пра праект Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «На хвалі часу, у плыні жыцця», у рамках якога створаны віртуальны раздзел да 115-годдзя з дня нараджэння Яна Скрыгана. Дзякуючы гэтаму рэсурсу і Галіне Скрыган, якая ўдзельнічала ў яго стварэнні, ёсць магчымасць спампоўваць кнігі пісьменніка ў поўным аб'ёме, чытаць успаміны яго дачкі.

Цяпер ідзе актыўная падрыхтоўка да адзначэння 120-годдзя з дня нараджэння Яна Скрыгана. Хочацца спадзявацца, што ў 2025 годзе, да юбілею, зноў адбудуцца яскравыя падзеі, якія аб'яднаюць яго родных і прыхільнікаў. І няхай, па словах Галіны Скрыган, памятны камень *«стане пуцяводнай зоркай усім, хто захоча пагаварыць з пісьменнікам»*.

**Таццяна ЛАЎРЫК**

